# Крэатыў з бабулінага куфра

**Цікавую выставу зладзілі ў сценах свайго інтэрната № 3 студэнты-аграмеханікі. На ёй прадстаўлены скарбы «з бабулінага куфра» як зашыфраваны аповед пра жыццё беларускага народа і родную прыроду. Узоры тканых і вышытых вырабаў пераліваліся ружовымі, зялёнымі, блакітнымі колерамі. «У роднай старонцы, у кожнай хаціне ручнік з абразамі, ручнік на дзяціне. Яго ў пасаг нам дзяды завяшчалі, каб талент народа ў вяках шанавалі».**



Адкрыццё выставы атрымалася як экскурс у мінулае нашых продкаў. Вядучыя ў нацыянальным адзенні – студэнты Цімур Цвірко, гр. 2м, і Эдуард Юшкоў, гр. 94м – ветліва сустракалі гасцей. Гучалі папулярныя беларускія мелодыі, дапаўнялі карціну свята слайды аб Беларусі, за іх падрыхтоўку адказваў першакурснік Даніла Леанчук. На адкрыцці выставы прысутнічалі студэнты іншых інтэрнатаў, супрацоўнікі аддзела выхаваўчай работы з моладдзю. Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы выставы прымалі студэнты Аляксей Калеснік, гр. 5м, Павел Чуманевіч, Віталій Бычкоў, Іван Карась, гр. 94м, Даніла Леанчук, гр. 1м, Мікіта Чайкоўскі, гр. 2м, Цімур Цвірко, гр. 2м, і Эдуард Юшкоў, гр. 94м.

Не сакрэт, што для таго, каб любіць сваю Радзіму, зберагчы аўтэнтычную спадчыну, трэба ведаць гісторыю страны, побыт нашых продкаў. Удзельнікі мерапрыемства быццам здзейснілі падарожжа і апынуліся ў далёкім мінулым, калі людзі самі сабе ткалі адзенне, многа працавалі і амаль усе жылі ў вёсках.





Ажыццявіць ідэю з выставай студэнтам дапамагалі загадчык інтэрната Г.Ф. Ігнатава, выхавацель Л.М. Грыгаровіч, вахцёры Т.М. Юк, К.У. Ганжурова і іншыя. Напрыклад, шмат рэчаў атрымалася «з куфра» Наталлі Ярославаўны Воранавай. Ёсць экспанаты, якім больш за 100 гадоў. Прадстаўлены вырабы з розных куточкаў рэспублікі, напрыклад, Кармянскага раёна Гомельскай вобласці, Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці і іншых. Адмысловая аповесць пра жыццё народа, яго працу, шчасце і гора, мары і надзеі.

Атрымалася не проста выстава, а крэатыўнае вандраванне па схованках бабулінага куфра. Студэнты даведаліся пра самыя розныя рэчы, што, спадзяемся, пакіне добры след у памяці кожнага ўдзельніка мерапрыемства, і атрымалі задавальненне ад дакранання да мінулага.

**Мікіта ЧАЙКОЎСКІ, гр. 2м АМФ**
**На здымках: адкрыццё выставы.**
**Фота В. Ермакова**



*Поздравляем с юбилеем!*

**РЫЛО Татьяну Валентиновну**, старшего преподавателя кафедры практической лингвистики, **01.05**
**УСТИНОВА Сергея Геннадьевича**, коменданта учебно-исследовательского корпуса в д.Боровляны, **12.05**
**ХМЕЛЬНИЦКУЮ Алевтину Иосифовну**, уборщика помещений учебно-лабораторного корпуса в д.Боровляны, **16.05**
**ШАЙКО Ирину Владимировну**, уборщика помещений учебно-лабораторного корпуса № 1, **22.05**
**ШАБАРА Александра Антоновича**, столяра общежития № 7, **28.05**
**ЦУБАНОВА Игоря Александровича**, старшего преподавателя кафедры энергетики, **31.05**